Сяргей НОВІКАЎ

# Германская акупацыйная палітыка на тэрыторыі Прыбалтыкі і Беларусі ў 1941—1944 гг.

*Аб важнасці звароту беларускіх даследчыкаў да матэрыялаў сучаснай айчыннай і замежнай гістарыяграфіі ішла зацікаўленая размова падчас пасяджэння круглага стала, прысвечанага 20-годдзю "Беларускага гістарычнага часопіса". Зварот да замежных даследаванняў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны тым больш актуальны, што ў апошні час выйшлі новыя працы, якія дазваляюць не толькі значна пашырыць, але і істотна паглыбіць веды аб гісторыі Беларусі гэтага перыяду.*

У сярэдзіне 2012 г. у нямецкім выдавецтве "Фердынанд Шонінг" выйшла з друку 8-я кніга з серыі "Эпоха сусветных войнаў". Яна мае назву "Рэйхскамісарыят Остланд. Месца дзеянняў і аб'ект памяці"* і складаецца з 18 навуковых артыкулаў. У 12 артыкулах разглядаюцца падзеі на тэрыторыі Рэйхскамісарыята Остланд у цэлым, 2 прысвечаны Беларусі, 2 — Латвіі, па 1 — Літве і Эстоніі.

У прадмове да выдання кіраўнік Цэнтра ваеннагістарычных даследаванняў у Патсдаме** доктар навук **Г.-Г.Мак** адзначае, што ў прадстаўленай рабоце даследчыкі спрабуюць выявіць узаемасувязі паміж гістарычнымі з'явамі і адбудаваць на гэтай аснове храналогію падзей на адной з частак часова акупаваных усходніх тэрыторый (с. 7). Аўтар заўважае, што выданне з'яўляецца вынікам сталага супрацоўніцтва трох устаноў — Інстытута сучаснай і рэгіянальнай гісторыі Фленсбургскага ўніверсітэта (зямля Шлезвіг-Гольштэйн), Цэнтра ваенна-гістарычных даследаванняў у Патсдаме і Германскага гістарычнага інстытута ў Варшаве.

Уводны артыкул навуковага супрацоўніка Інстытута сучаснай і рэгіянальнай гісторыі доктара навук **С.Лемана** носіць назву *"Рэйхскамісарыят Остланд — месца дзеяння і аб'ект памяці. Уводзіны"* (с. 9—34). У першых радках аўтар раскрывае галоўную прычыну даследавання падзей ваеннай гісторыі ў гэтым рэгіёне, прыводзячы шматлікія факты ўзаемасувязі гісторыі зямлі Шлезвіг-Гольштэйн і тэрыторыі Рэйхскамісарыята Остланд у 1941—1944 гг. (с. 10).

* Reichskommissariat Ostland. Tatort und Erinnerungsobjekt. Eine Publikation des Instituts für schleswig-holsteinische Zeit- und Regionalgeschichte der Universität Flensburg und des Militärgeschichtlichen Forschungsamtes / Hrsg. durch Sebastian Lehmann gemeinsam mit Robert Bohn und Uwe Danker. Paderborn— München—Wien—Zürich: FERDINAND SCHÖNING, 2012. — 371 s. Аўтар рэцэнзіі выказвае шчырую падзяку сарэдактару калектыўнай працы доктару Себасцьяну Леману за дасланы экземпляр.

** З 1 студзеня 2013 г. — Цэнтр ваеннай гісторыі і сацыяльных навук бундэсвера Германіі.



***НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч.***
*Загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1954 г. у в. Радзіца Крупскага раёна Мінскай вобласці, у 1980 г. закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны і крыніцазнаўства. Аўтар манаграфій "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004), больш за 270 навуковых публікацый. З'яўляецца сарэдактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць" (Вып. 1—11, Мн., 2002—2013).*




Аўтар артыкула адзначае, што з пачаткам вайны Германіі супраць СССР на тэрыторыі краін Прыбалтыкі і Беларусі быў створаны новы орган цывільнага кіравання — Рэйхскамісарыят Остланд. У ліпені 1941 г. яго ўзначаліў гаўляйтар акругі НСДАП Шлезвіг-Гольштэйн Г.Лозэ. Ён прызначыў з ліку сваіх падначаленых (многія з якіх да таго ж былі ўраджэнцамі зямлі Шлезвіг-Гольштэйн) больш за чвэрць гебітскамісараў у Остландзе. Сярод апошніх былі і тыя, каго прызначылі кіраўнікамі на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь — у Мінску, Слуцку, Лепелі (с. 18). Заўважым, аднак, што Лепель уваходзіў у зону тылу групы армій "Цэнтр"*, а не ў склад Генеральнай акругі Беларусь, як можна зразумець з артыкула С.Лемана.

Звернем увагу чытача і на адзін з ключавых навуковых тэрмінаў, які выкарыстоўваюць аўтары працы, а менавіта тэрмін *"камісарыят"*. Ён ужываецца ў кнізе адначасова ў дачыненні і да тэрытарыяльнай адзінкі, і да адміністрацыйнага органа нямецкай цывільнай улады ў Рэйхскамісарыяце Остланд. У выніку атрымліваецца, што галоўным суб'ектам акупацыйнай улады ў Беларусі, Літве, Латвіі і Эстоніі з'яўлялася адзіная нямецкая выканаўчая і тэрытарыяльная структура — камісарыят. Падыход жа айчыннай гістарыяграфіі прадугледжвае, што існавала тэрытарыяльная адзінка — Генеральная акруга (Generalbezirk)**, якая выступала аб'ектам, а не суб'ектам дзейнасці. Атрымліваецца, што камісарыяты як адзіны орган нямецкай акупацыйнай адміністрацыі не разглядалі тэрыторыю, яе жыхароў і мясцовыя органы тагачаснай улады ў якасці самастойных суб'ектаў дзейнасці нямецкай акупацыйнай улады на тэрыторыі генеральных акруг Беларусь, Літвы, Латвіі і Эстоніі.

С.Леман заўважае, што ў навуковых даследаваннях доўгі час дамінаваў разгляд германскай акупацыйнай палітыкі на прыкладзе дзейнасці цывільнай адміністрацыі. І толькі ў апошні час у фокус навуковых пошукаў сталі трапляць пытанні, звязаныя з Халакостам і калабарацыяй мясцовага насельніцтва. У гэтай справе ў прапанаваным даследаванні зроблены значныя крокі наперад, аднак застаецца актуальнай патрэба ў сінтэзе атрыманых вынікаў на ўзроўні не мясцовай, а цэласнай гісторыі. Асабліва важным гэта бачыцца для нямецкага гісторыка ў кантэксце з'яўлення новых даследчыцкіх парадыгмаў "гістарычнай палітыкі" і "культуры памяці": у першым выпадку размова ідзе аб ліквідацыі закрытых тэм і белых плямаў у навуковых даследаваннях; у другім — аб уключэнні ў агульнае палатно памяці ўсіх падзей, якія мелі месца ў гісторыі.

Адразу ж звернем увагу беларускага чытача на той факт, што ў сваіх артыкулах аўтары працы разглядаюць галоўным чынам гісторыю цывільнай адміністрацыі, Халакосту і мясцовай калабарацыі. Між тым не звернута належнай увагі на наступствы нацысцкага генацыду ў дачыненні да прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, а таксама на гісторыю баявога супраціву акупантам на тэрыторыі Беларусі, Літвы, Латвіі і Эстоніі. Дарэчы, гэтыя праблемы згадваюцца ў працы (с. 37), але падрабязна не раскрываюцца. Уключэнне ж гэтай важнай тэматыкі ў зборнік навуковых артыкулаў стварыла б магчымасці для паказу больш рэальнай карціны трагедыі мірнага насельніцтва, а таксама маштабаў барацьбы жыхароў гэтых краін з акупантамі.

Адкрывае кнігу матэрыял кіраўніка Цэнтра па даследаванні антысемітызму Берлінскага тэхнічнага ўніверсітэта прафесара **В.Бенца** *"У ценю Асвенціма. Халакост у Прыбалтыцы"* (с. 35—49). У ім аўтар спрабуе вырашыць наступныя задачы: выявіць намеры і канкрэтныя дзеянні германскай акупацыйнай улады; высветліць адносіны мясцовага насельніцтва да знішчэння яўрэяў; вызначыць адрозненні ў рэалізацыі нацысцкай палітыкі вынішчэння яўрэяў у балтыйскіх краінах і іншых акупаваных рэгіёнах. У артыкуле адзначаецца, што на тэрыторыі прыбалтыйскіх краін Халакост вызначаўся двума важнымі аспектамі: па-першае, знішчэннем тут яўрэяў, дэпартаваных з Германіі, Аўстрыі і іншых еўрапейскіх краін; па-другое, знішчэннем мясцовага яўрэйскага насельніцтва (с. 36). Адразу ж заўважым, што падобны навуковы пасыл парушае храналогію гістарычных падзей, паколькі пытанне аб дэпартацыі і знішчэнні яўрэяў з Германіі і краін Заходняй Еўропы было пастаўлена на парадак дня толькі ў сярэдзіне кастрычніка 1941 г.***. Галоўнай перадумо-

* Reichskommissariat Ostland nach dem Stande vom 1.5.1942 // НАРБ. Ф. 393, воп. 1, спр. 1, арк. 70.

** Stenogramm der Arbeitstagung von Oberleitern des Generalbezirkes Weißruthenien (Minsk, 8.—10. April 1943) // Стенограмма совещания высшего руководства Генерального округа "Белоруссия" (Минск, 8—10 апреля 1043 года) / авт.-сост. С.В.Жумарь, С.Е.Новиков, Р.А.Черноглазова. Мн., 2006. С. 9; Reichelt K. Lettland unter deutscher Besatzung 1941—1944. Der lettische Anteil am Holocaust. Berlin, 2011. S. 106.

*** Gerlach Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrußland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999. S. 750.




*Карта Рэйхскамісарыята Остланд па стану на 1 студзеня 1944 г.* Складзена ў Цэнтры ваенна-гістарычных даследаванняў у Патсдаме (ФРГ).

вай для правядзення палітыкі вынішчэння на захопленай савецкай тэрыторыі было ўсталяванне тут германскага акупацыйнага рэжыму.

На думку В.Бенца, вынішчэнне мясцовага яўрэйскага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі СССР адбывалася ў дзве хвалі і мела сваю спецыфіку. Першая хваля пачалася з першых дзён германскай акупацыі, калі ахвярамі палітыкі вынішчэння сталі сотні тысяч яўрэяў — ад немаўлят да знямоглых і старых. Галоўнымі выканаўцамі злачынстваў з'яўляліся мабільныя каманды паліцыі бяспекі і СД, якія дзейнічалі ў складзе айнзацгруп А і Б. Былі ўдзельнікамі масавых забойстваў таксама і падраздзяленні паліцыі парадку і палявыя часці вермахта. У рамках першай хвалі пачалі стварацца гета, якія паўтаралі "польскую мадэль" (калі яўрэйскае насельніцтва сканцэнтроўвалі ў асобным раёне горада ці мястэчка, пазбаўлялі ўласнасці, "маркіравалі", а потым выкарыстоўвалі ў якасці працоўнай сілы). Узнікненне гета стала пачаткам не толькі працэсу гетаізацыі, але і стварэння *"шматступенчатай сістэмы эксплуатацыі, тэрору і кантролю, якая садзейнічала таму, што штодзённа яўрэі жылі ў ценю смерці"* (с. 39). На думку нямецкага даследчыка, галоўнай мэтай перасялення яўрэяў у гета была канцэнтрацыя іх у гарадах дзеля знішчэння ў будучым. Аднак у нацысцкіх акупантаў узніклі цяжкасці, звязаныя з немагчымасцю вырашыць яўрэйскае пытанне ў першапачатկова вызначаны тэрмін.

Даследчык адзначае, што з пачатку 1942 г. праходзіла другая хваля масавага вынішчэння мясцовых яўрэяў. Аналіз падзей у гета прывёў аўтара да высновы, што ў прамежку часу паміж дзвюма хвалямі забойствы яўрэяў не спыняліся поўнасцю, а проста вяліся не так інтэнсіўна. З матэрыялу вынікае, што нацысцкая палітыка вынішчэння не абмяжоўвалася толькі практыкай "канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання" на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Вынікам стала вялікая колькасць ахвяр, якая толькі ў Беларусі дасягнула 2,23 млн чалавек (с. 42) (заўважым, што сучасныя беларускія даследчыкі прыводзяць лічбу 3 млн. — **С.Н.**). У гэтай сувязі беларускаму чытачу было б цікава ведаць, якую долю ў гэтай лічбе складала мясцовае яўрэйскае насельніцтва, а таксама яўрэі, дэпартаваныя ў Мінск з краін Еўропы.

В.Бенц адзначае, што на заключным этапе ліквідацыі гета на тэрыторыі Прыбалтыкі быў уведзены "новы інструментарый", які ў адпаведнасці з распараджэннем Г.Гімлера ад 21 чэрвеня 1943 г. павінны былі стаць канцэнтрацыйныя лагеры ў ваколіцах Рыгі (Рыга-Кайзервальд), Каўнаса (IX форт), Таліна (Вайвара). Пры гэтым аўтар заўважае, што лагеры, створаныя на тэрыторыі Рэйхскамісарыята Остланд па ўзоры канцэнтрацыйных лагераў і лагераў вынішчэння накшталт Дахаў, Бухенвальда, Заксенхаўзена, Равенсбрука і Асвенціма, не адпавядалі ў поўным сэнсе класіфікацыі лагераў, якія з'яўляліся ў нацысцкай Германіі пасля падпалу рэйхстага ў 1933 г. спецыяльным інструментам дзяржаўнага тэрору і палітычнага пераследу (с. 43).

Важнай нам падаецца спроба В.Бенца паказаць асноўныя месцы вынішчэння мясцовых і дэпартаваных яўрэяў, а таксама назваць колькасць ахвяр. Аднак у артыкуле не называецца агульная лічба ахвяр сярод яўрэяў у кожнай з Прыбалтыйскіх краін. Узнікае лагічнае пытанне: якімі ж былі фактычныя маштабы Халакосту ў Рэйхскамісарыяце Остланд, у тым ліку на тэрыторыі кожнай з чатырох генеральных акруг — Беларусі, Латвіі, Літвы і Эстоніі. І ўрэшце рэшт даследаванне гісторыі Халакосту на тэрыторыі кожнай з гэтых акруг нельга лічыць завершаным не столькі таму, што гэта праблематыка застаецца спрэчнай у сучаснай замежнай гістарыяграфіі*, колькі ў сувязі з адсутнасцю комплекснага параўнаўчага даследавання на прыкладзе канкрэтных рэгіёнаў на тэрыторыі Рэйхскамісарыята Остланд. Асабліва пад вуглом выяўлення агульнага і адметнага ў ходзе правядзення нацысцкай палітыкі "канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання" на ўсходніх акупаваных тэрыто-

* Reichelt K. Lettland unter deutscher Besatzung 1941—1944. Die lettische Anteil am Holocaust. Berlin, 2011. S. 25.

рыях. Зазначым, што адказ на гэтае і іншыя пытанні бачыцца нам асабліва важным у кантэксце стварэння адзінага навуковага факталагічнага і метадалагічнага базісу для правядзення даследаванняў на аснове кампаратыўнага аналізу германскай акупацыйнай палітыкі на тэрыторыі Рэйхскамісарыята Остланд. Наколькі рознымі былі наступствы той трагедыі, калі разглядаць яе на рэгіянальным узроўні? На жаль, гэтыя важныя пытанні пакуль застаюцца без належнага адказу прафесійнага нямецкага гісторыка.

На наш погляд, выхаду з "ценю Халакосту" могуць садзейнічаць пошукі адказу на пытанні і метадалагічнага кшталту. Паводле нямецкіх дакументаў, вынішчэнне яўрэяў на акупаваных усходніх тэрыторыях было звязана з "канчатковым вырашэннем яўрэйскага пытання"*. У прапанаваным матэрыяле можна сустрэць наступныя назвы гэтай гістарычнай з'явы: "Халакост", "Шоа", "знішчэнне яўрэяў". Узнікае пытанне: якое азначэнне лепш за ўсё раскрывае сутнасць той гістарычнай з'явы, трагічныя наступствы якой перажылі многія краіны Еўропы, у тым ліку Беларусь? Адказ на гэтае пытанне вельмі важны, паколькі ў сучаснай нямецкай гістарыяграфіі тэрмін "Халакост" амаль не ўжываецца. У прыватнасці, гэтага тэрміна няма ў "Энцыклапедыі нацыянал-сацыялізму"**.

У артыкуле *"Паміж прыгнётам і вынішчэннем. Палітыка Рэйхсміністэрства для акупаваных усходніх абласцей"* (с. 51—67) доктар навук **Э.Піпэр** з гістарычнага факультэта Патсдамскага ўніверсітэта характарызуе праграму дзейнняў Імперскага міністэрства па справах акупаваных усходніх тэрыторый на чале з А.Розенбергам у дачыненні да Рэйхскамісарыята Остланд. Аўтар паказвае ступень удзелу самаго А.Розенберга і падпарадкаваных яму службаў у распрацоўцы планаў і вырашэнні задач па ліквідацыі яўрэяў (с. 59). Як бачна з прыведзеных дакументальных матэрыялаў, у асобе міністра гэтая структура з'яўлялася прамым абаронцам ідэй правядзення палітыкі вынішчэння на ўсходніх тэрыторыях (с. 67). У якасці пацвярджэння гэтага тэзісу аўтар прыводзіць шэраг доказаў, у тым ліку факт таго, што два дзяржаўныя сакратары міністэрства — А.Майер і О.Ляйббрант — бралі ўдзел у сумнавядомай Ванзейскай канферэнцыі 20 студзеня 1942 г., на якой прадстаўнікамі вышэйшага кіраўніцтва нацысцкай Германіі было прынята рашэнне аб канчатковай ліквідацыі яўрэяў. Акрамя таго кіраўнікі гебітскамісарыятаў Рэйхскамісарыята Остланд дакладалі "наверх" аб маштабным вырашэнні яўрэйскага пытання на тэрыторыі генеральных акруг — Беларусі, Літвы, Латвіі і Эстоніі (с. 66). Адносна Генеральнай акругі Беларусь прыводзяцца звесткі аб тым, што з канца вясны да сярэдзіны лета 1942 г. на гэтай тэрыторыі было ліквідавана 55 тысяч яўрэяў.

У сваім артыкуле *"Значэнне тэрору і забойстваў у канцэпцыі германскай акупацыйнай палітыкі ў Прыбалтыцы"* (с. 69—87) прадстаўнік Фонду садзейнічання навуцы і культуры ў Гамбургу доктар навук **А.Ангрык** разгледзеў вызначальныя кампаненты германскай палітыкі пераследу, эксплуатацыі і вынішчэння ў Літве, Латвіі і Эстоніі. Ён вызначыў асобныя фазы гэтай палітыкі і меры адказнасці тых, хто забяспечваў яе правядзенне. Таксама ў артыкуле праведзена параўнанне, накіраванае на выяўленне адметнасцей і падабенства гэтай палітыкі з палітыкай у іншых акупаваных рэгіёнах, у тым ліку Беларусі.

Аналіз дзейнасці службаў СС і паліцыі, цывільнай адміністрацыі і вермахта прывёў нямецкага гісторыка да наступных высноў: 1) цывільная адміністрацыя атрымала значную выгаду ад хуткай перадачы ёй улады ад ваеннай адміністрацыі. Яна магла выкарыстоўваць мясцовую рабочую сілу, канфіскоўваць маёмасць яўрэяў і г.д.; 2) у трох былых прыбалтыйскіх краінах сярод насельніцтва знаходзіліся людзі, якія былі гатовыя да супрацоўніцтва з нямецкай уладай для таго, каб аднавіць нацыянальную самастойнасць сваіх краін; 3) "галоўным рэсурсам" для службаў вермахта, а пасля і цывільнай адміністрацыі стала мясцовая рабочая сіла, якая пасля "канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання" з'яўлялася адзінай крыніцай пастаўкі мясцовага насельніцтва на работы ў рэйх; 4) у сувязі з дэпартацыяй нямецкіх яўрэяў на тэрыторыю чатырох генеральных акруг Рэйхскамісарыята Остланд палітыка ў дачыненні да яўрэяў на гэтай тэрыторыі згубіла характар рэгіянальнай, а набыла маштаб еўрапейскай. Прычым у Беларусі, Літве, Латвіі, Эстоніі яна адрознівалася ад той палітыкі па "канчатковым вырашэнні яўрэйскага пытання", што праводзілася ва Украіне і ў паўднёвых раёнах СССР. У дачыненні ж да астатніх злачынстваў германскіх акупантаў — забойства цыган, патурання маштабнай смяротнасці сярод савецкіх ваеннапалонных, ліквідацыі людзей з фізічнымі пашкоджаннямі — палітыка вынішчэння адрозненняў не мела (с. 86—87).

У артыкуле *"Гета ў генеральным камісарыяце Беларусь"* (с. 89—99) доктар навук **М.Дзін**, супрацоўнік Цэнтра па сучасным даследаванні Халакосту і Мемарыяльнага музея Халакосту ў Вашынгтоне (аўтар адзначае, што ў сваім матэрыяле не прадстаўляе пункт погляду гэтых цэнтраў. — **С.Н.**), аналізуе рэалізацыю германскай цывільнай уладай расавай акупацыйнай палітыкі ў дачыненні да яўрэйскіх гета, створаных на тэрыторыі акругі Беларусь. Каб выявіць факты правядзення дыферэнцыраванай палітыкі па знішчэнні яўрэяў, даследчык выкарыстоўвае метад мікрапараўнання, аснову якога складае падрабязны аналіз фактаў з гісторыі ўзнікнення, існавання і ліквідацыі кожнага з існаваўшых у Генеральнай акрузе Беларусь гета. Ён прыходзіць да высновы, што гэтая палітыка не насіла выключна цэнтралізаванага характару, а вар'іравалася ў залежнасці ад канкрэтных абставін (с. 98).

На тэрыторыі акругі існавалі самыя розныя віды яўрэйскіх гета — вынішчэння, адкрытыя і закрытыя,

* Angrik A., Klein P. "Die Endlösung in Riga": Ausbeutung und Vernichtung (1941—1944). Darmstadt, 2006.

** Enzyklopädie des Nationalsozialismus / Hrsg. von Wolfgang Benz, Hermann Graml und Hermann Weiß. Stuttgart, 1998. S. 518.

рабочыя, рэшткавыя. Значныя адрозненні праяўляліся і ў ходзе самаго працэсу гетаізацыі (стварэння гета). Так, у акрузе Мінск гета пачалі стварацца даволі рана, на этапе знаходжання тэрыторыі ў падпарадкаванні ваеннай адміністрацыі. Гэта ў большасці выпадкаў прыводзіла да хуткага знішчэння яўрэяў. У той жа час у іншых акругах (Навагрудак, Слонім, Глыбокае) працэс стварэння гета праходзіў бессістэмна, быў завершаны толькі ў пачатку — сярэдзіне 1942 г., і фактычна супаў з другой, галоўнай хваляй па ліквідацыі гета, якая адбывалася з красавіка 1942 да пачатку 1943 г. Паралельна з вынішчэннем яўрэяў назіралася часовае выкарыстанне іх у якасці рабочай сілы. Аднак у новых умовах галоўным для акупацыйнай улады стала захаванне бяспекі сваёй адміністрацыі. Яно патрабавала канчатковай ліквідацыі рэшткаў гета і працоўных лагераў з яўрэямі (с. 99).

У сваім матэрыяле амерыканскі даследчык зыходзіць з таго факту, што на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь нямецкімі службамі было створана больш за 90 гета. У постсавецкай гістарыяграфіі прынята іншая агульная лічба — не менш за 135 гета. Яны былі створаны на тэрыторыі Беларусі з лета 1941 да вясны 1942 г., самым буйным лічылася мінскае гета*. Такім чынам, пытанне аб агульнай колькасці гета на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь застаецца адкрытым.

М.Дзін лічыць, што працэс стварэння гета на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь ахопліваў прамежак часу ад лета 1941 да лета 1942 г. і праходзіў у форме масавага знішчэння мясцовага яўрэйскага насельніцтва пры непасрэдным удзеле паліцыі (паліцыі бяспекі і службаў бяспекі), вермахта, паліцыі парадку, СС і асобных дапаможных фарміраванняў з жыхароў акупаваных тэрыторый. Пры гэтым з агульнай масы ахвяр часта вылучалі кваліфікаваных яўрэяў, якіх потым утрымлівалі ў працоўных лагерах ці ў "рэшткавых гета".

Амерыканскі даследчык заўважае, што ў гістарыяграфіі фактычна не існуе дакладных звестак аб колькасці яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь па стану на жнівень 1941 г. Сам М.Дзін прыводзіць лічбу больш за 300 тысяч чалавек, аднак не падмацоўвае яе дакладнай спасылкай на дакументальныя крыніцы. Адносна г. Мінска ў матэрыяле аўтара прыводзяцца перадваенныя звесткі: паводле статыстычных даных на 1939 г., у горадзе былі зарэгістраваны 70 998 яўрэяў, што складала амаль 30% ад агульнай колькасці гарадскога насельніцтва. Заўважым, што амерыканскі аўтар не ўлічыў тых змен, якія адбыліся напярэдадні вайны ў сталіцы Беларусі. На 1 студзеня 1941 г. агульная колькасць жыхароў горада складала ўжо каля 300 тыс. чалавек**. Адпаведна доля яўрэяў у сталіцы на той момант зменшылася ў параўнанні з 1939 г.

З самага пачатку германскай акупацыі падраздзяленнямі айнзацгруп пры падтрымцы службаў СС, паліцыі і вермахта былі праведзены першыя акцыі па знішчэнні камуністаў, яўрэяў і інтэлігенцыі. Кажучы пра гэта, на наш погляд, неабходна адрозніваць акцыі вынішчэння яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі, паказваючы канкрэтныя рамкі нацысцкіх злачынстваў прадстаўнікамі нямецкіх ваенных, паліцэйскіх, эсэсаўскіх і цывільных службаў. Найбольш значнымі сталі акцыі па знішчэнні яўрэяў у Мінску і Слоніме. Колькасць ахвяр у гэтых гарадах перавысіла тысячу чалавек. У жніўні пачалося масавае вынішчэнне яўрэйскіх дзяцей і жанчын, пачатак якому, на яго думку, быў пакладзены падзеямі ў Ганцавічах (с. 90). На наш погляд, размову неабходна весці не толькі аб гэтым населеным пункце, а пра шэраг населеных пунктаў: пачынаючы ад Хомска, Моталя, Целеханаў, у напрамку на Драгічын, Янаў, Пінск, Давыд-Гарадок, Лунінец і іншыя месцы. У іх у выніку гэтай акцыі былі вынішчаны тысячы яўрэяў — жанчыны, дзеці, мужчыны, у тым ліку працаздольнага ўзросту.

Гаворачы пра пачатак стварэння гета, М.Дзін адзначае той факт, што загады аб гэтым былі аддадзены ваенным камандаваннем у ліпені—жніўні 1941 г., каб перакрыць яўрэям "нелегальныя" шляхі выхаду з беларускіх гарадоў. З гэтага часу яўрэі павінны былі насіць жоўтыя нашыўкі на адзенні, ім забаранялася пакідаць месца знаходжання, займацца гандлем, наведваць рынкі і хадзіць па тратуарах. З верасня 1941 г. — моманту перадачы камандаваннем тылу групы армій "Цэнтр" улады ў рукі цывільнага кіраўніцтва на чале з генеральным камісарам Беларусі В.Кубэ — паліцыя бяспекі праводзіла акцыі па ліквідацыі гета сумесна з органамі цывільнай адміністрацыі (с. 92). На прыкладзе акругі Глыбокае даследчык паказвае, што паралельна працэсу стварэння гета адбывалася іх планамерная ліквідацыя. У першую чаргу гэта тычылася малых гета, якія былі знішчаны ўжо ў канцы лета 1941 г. Як вынік, праз год на тэрыторыі акругі заставалася толькі некалькі гета. У ходзе акцый па ліквідацыі гета нямецкія службы пачалі вылучаць працаздольных яўрэяў і пераводзіць іх у асобныя працоўныя лагеры.

У артыкуле прыведзена карта, складзеная амерыканскім даследчыкам і ўпершыню ўведзеная ў навуковы зварот у "Энцыклапедыі лагераў бежанцаў і гета 1933—1945"***. На ёй адзначаны гета, што былі створаныя, пэўны час існавалі і ў рэшце рэшт былі ліквідаваныя на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь у 1941—1943 гг. (с. 99). Карта тым больш важная, што ў беларускіх выданнях падобных наглядных матэрыялаў няма.

Разглядаючы падзеі ў акрузе Навагрудак, М.Дзін адзначае, што там працэс стварэння гета меў тры галоўныя хвалі. На працягу першай былі створаныя гета ў Любчы, Івянцы, Рубяжэвічах і Навагрудку, куды былі пераведзены яўрэі з бліжэйшых вёсак. У лютым— сакавіку 1942 г. былі створаныя новыя гета ў

* Холокост на территории СССР: энциклопедия. М., 2009. С. 68.

** Пашпарт горада // Звязда. 1941, 5 студзеня.

*** Encyclopedia of Camps and Ghettos 1933—1945. Vol 2: Ghettos in German-Occupied Eastern Europe / Ed. by M.Dean. Bloomington, 2012.




Karte entnommen aus: Encyclopedia of Camps and Ghettos 1933–1945, vol. 2: Ghettos in German-Occupied Eastern Europe. Ed. by Martin Dean, Bloomington, IN 2012.

*Карта размяшчэння гета на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь, 1941—1943 гг.* Складзена М. Дзінам. 2012 г.

Карэлічах і Дварцы, куды павінны былі перасяліцца яўрэі з бліжэйшых вёсак. У маі 1942 г. яўрэі з населеных пунктаў акругі Навагрудак знаходзіліся або ў Навагрудку, або ў працоўным гета ў Дварцы. Новы працоўны лагер таксама быў створаны ў Вараб'ёвічах. Тых людзей, якія не маглі быць пераселеныя, малых дзяцей і людзей сталага ўзросту расстрэльвалі паблізу іх дамоў. З ліквідацыяй абсалютнай большасці яўрэяў гета ў Навагрудку і Дварцы набылі характар працоўных лагераў (с. 94). Паводле падлікаў амерыканскага гісторыка, у Беларусі існавала не менш за 12 адкрытых гета (г. зн. гета, якія не мелі агароджы і сістэмы кантролю). У тых гета, што заставаліся на той час, утрымліваліся рамеснікі, якія заставаліся там пасля ліквідацыі большасці яўрэяў у мястэчках Крывічы і Молчадзь. Цікава, што якраз у той час (у ліпені 1942 г.) у Генеральнай акрузе Беларусь заробак для працуючых яўрэяў быў павышаны з 0,4 да 0,8 рубля за гадзіну працы. Нямецкія органы цывільнай улады і службы вермахта актыўна выкарыстоўвалі яўрэйскую рабочую сілу, замест таго каб перадаваць яе службам СС для канчатковага знішчэння (с. 96).

На працягу 1942 г. праводзілася арганізаваная ліквідацыя гета на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь. Да канца года была ліквідавана абсалютная большасць яўрэяў, дэпартаваных у Беларусь з іншых краін. У некаторых акцыях супраць яўрэяў выкарыстоўваліся газавыя аўтамабілі (так званыя душагубкі). Амаль 20 тысячам яўрэяў у Беларусі ўдалося выратавацца з гета і ўцячы да партызан (с. 97). Апошнім гета, ліквідаваным у канцы кастрычніка 1943 г., было мінскае. Некалькі тысяч яўрэяў з Ліды і Мінска былі дэпартаваныя ў канцэнтрацыйныя лагеры на тэрыторыі Польшчы. Толькі зусім нязначнай частцы яўрэяў удалося выжыць. У гэтай сувязі беларускаму чытачу было б цікава ведаць, што ж з'яўлялася галоўным фактарам у справе выратавання яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі, дзе фактычна адсутнічалі праявы беларускага антысемітызму.

У матэрыяле *"Латышскі рэгіён Латгалія пад нямецкай акупацыяй 1941—1944. Рэакцыя насельніцтва"* (с. 101—115) **Ц.Плат**, супрацоўнік гістарычнага факультэта Грайфсвальдскага ўніверсітэта імя Эрнста-Морыца Арнта, расказвае аб уздзеянні германскай акупацыйнай палітыкі на розныя этнічныя групы, якія пражывалі ў беларуска-латышскім пагранiччы, на тэрыторыі Латгаліі. Гэты рэгіён меў свае адметныя мульцікультурныя рысы, якія сведчылі пра яго "асобны культурны шлях развіцця" (с. 103). На прыкладзе вывучэння падзей на тэрыторыі гэтага рэгіёна даследчык прыходзіць да высновы аб тым, што неабходна абавязкова параўноўваць факты, датычныя ўсёй тэрыторыі Латвіі і яе паўднёвай часткі — Латгаліі. Ён аналізуе працэс вынішчэння насельніцтва Латгаліі, пачатак якому быў пакладзены масавым забойствам мясцовых яўрэяў. З 1942 г. адбывалася дэпартацыя славянскага насельніцтва ў рэйх у якасці працоўнай сілы, а таксама назіраўся прыкметны ўздым барацьбы з акупантамі. Як адзначае даследчык, вынікам гэтага стала правядзенне акупантамі антыпартызанскіх акцый, падчас якіх значная частка мясцовага насельніцтва была захоплена і дэпартавана ў рэйх (с. 115).

Даследчык шведскага ўніверсітэта ва Упсале доктар навук **М.Кот** прапанаваў вынікі сінтэзу фактаў з гісторыі Эстоніі, Латвіі, Літвы і Беларусі ў матэрыяле *"Набор часцей СС у Рэйхскамісарыяце Остланд: спроба цяжка ўлоўнага сінтэзу"* (с. 117—145). Да гэтага часу даследчыкі пры вывучэнні названай праблемы часцей за ўсё абмяжоўваліся нацыянальнымі рамкамі. На прыкладзе Латвіі аўтар паказвае, што гісторыя фарміравання падобных падраздзяленняў пачалася з 1943 г., калі з былых ваеннаабавязаных былі створаныя ахоўныя батальёны, якія потым удзельнічалі ў вынішчэнні яўрэяў і іншых падобных акцыях на тэрыторыі камісарыята. Адносна Латвіі даследчык прыводзіць факты аб дзейнасці латышскага легіёна СС (с. 144).

На думку **А.Нольцэна**, супрацоўніка рэдакцыі выдання "Даклады па гісторыі нацыянал-сацыялізму" з Варбурга, маладаследаванай застаецца дзейнасць рэгіянальных структур НСДАП у кожным з акруговых камісарыятаў, што ўваходзілі ў склад Рэйхскамісарыята Остланд. У сваім матэрыяле *"Кіраўніцтва Остланда праз НСДАП: структура, функцыі, практыка"* (с. 147—169) аўтар не абмінае ўвагай Генеральную акругу Беларусь, заўважаючы, што яе насельніцтва складала трэцюю частку ад насельніцтва Рэйхскамісарыята Остланд. На тэрыторыі акругі акупацыйныя органы былі занятыя не столькі правядзеннем палітыкі "германізацыі" і "народнасці", як гэта бы-

ло ў прыбалтыйскіх акругах, колькі барацьбой з пастаянным узрастаннем уплыву партызан. Паколькі на тэрыторыі Беларусі патрабавалася надаваць значна больш увагі арганізацыі паліцэйскай і вайсковай бяспекі, службы НСДАП інтэнсіўней працавалі над ідэалагічным выхаваннем саміх немцаў, чым гэта рабілася ў прыбалтыйскіх акругах. У пачатку 1943 г. характар гэтай работы на акупаваных савецкіх тэрыторыях прынцыпова змяніўся. Цяпер яна была накіраваная галоўным чынам на "мабілізацыю" мясцовых сіл на барацьбу супраць "бальшавізму" (с. 160).

Сярод аднаго з крокаў акупацыйнай адміністрацыі аўтар адзначае пашырэнне ўдзелу беларускага насельніцтва ў кіраўніцтве справамі генеральнага камісарыята Беларусь, асабліва адносна "ліквідацыі польскай і яўрэйскай праблем". На прыкладзе дзейнасці Саюза беларускай моладзі, створанага летам 1943 г., бачна, што акружныя структуры НСДАП не мелі ніякага ўплыву на гэту маладзёжную арганізацыю, паколькі фактычна павінны былі курыраваць іншыя групы мясцовага насельніцтва, у першую чаргу палякаў і яўрэяў (с. 161). Заўважым, што, разглядаючы дзейнасць СБМ на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь, даследчык, як і многія іншыя аўтары, не выкарыстаў спецыяльныя працы беларускіх гісторыкаў*.

А.Нольцэн прыйшоў да высновы, што ў адрозненне ад ваенных органаў, партыйныя органы НСДАП існавалі на тэрыторыі Рэйхскамісарыята Остланд толькі з лета 1942 г. па восень 1944 г. і за гэты час набылі толькі пачатковую форму. У фокусе іх дзейнасці знаходзіліся галоўным чынам немцы. Пад партыйнае куратарства трапілі 2235 рэйхсдойчэ (імперскіх немцаў), занятых у складзе цывільнага кіраўніцтва чатырох генеральных акруг, а таксама фольксдойчэ (мясцовыя немцы), колькасць якіх у 1942 г. у трох прыбалтыйскіх акругах складала 113 тыс. чалавек, а на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь — усяго 5 тыс. чалавек (с. 167).

Аб імкненні выкарыстаць старажытную гісторыю для абгрунтавання нацысцкай акупацыі гэтай тэрыторыі распавёў у сваім артыкуле *"Інструменталізацыя прагісторыі ў гісторыю Рэйхскамісарыята Остланд"* (с. 171—187) магістр Хельсінкскага ўніверсітэта **М.Гашэ**. Ён паспрабаваў знайсці адказ на наступнае пытанне: наколькі цывільная адміністрацыя ўлічвала факты з рэгіянальнай гісторыі часоў Сярэдневякоўя, каб потым выкарыстаць іх для абгрунтавання ўключэння гэтых раёнаў у склад вялікагерманскага рэйха? Так, для пошуку вытокаў германскіх плямёнаў у Эстоніі, Латвіі і Літве была створана група даследчыкаў на чале з прафесарам Грайфсвальдскага ўніверсітэта К.Энгелем. Прадстаўнікі гэтай групы шукалі сляды германскага мінулага ў тым ліку і на тэрыторыі Міншчыны. У верасні 1942 г. генеральны камісар В.Кубэ паведамляў начальніку РСХА Г.Гімлеру, што на ўзвышшы непадалёку ад Мінска выяўлены "раннія пасяленні германцаў" (с. 181).

Моўнай сітуацыі на тэрыторыі Беларусі прысвечаны артыкул магістранта Цюбінгенскага ўніверсітэта **А.Анціпавай** пад назвай *"Нацысцкая моўная палітыка ў Беларусі"* (с. 189—208). Пры разглядзе нямецкай акупацыйнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі даследчыца зыходзіць з тэзісу аб тым, што на захопленых землях акупанты імкнуліся дасягнуць трох мэт: эканамічнага рабавання тэрыторыі, перасялення большай часткі мясцовага насельніцтва на іншыя тэрыторыі і знішчэння астатняй яго часткі. Пры гэтым яны станоўча ставіліся да "беларусізацыі", што праяўлялася ў правядзенні моўнай палітыкі (с. 189). Адразу заўважым, што моўную палітыку на тэрыторыі Беларусі ў гады германскай акупацыі нельга непасрэдна ўспрымаць як клопат захопнікаў аб мясцовай "беларусізацыі", паколькі з самага пачатку гэтая палітыка цалкам адпавядала расавай тэорыі і нацысцкім планам вынішчэння, рабаўніцтва і эксплуатацыі акупаваных усходніх тэрыторый, у тым ліку Беларусі.

Даследчыца прапануе падзяляць германскую акупацыю на чатыры фазы: 1) з ліпеня па жнівень 1941 г. тэрыторыя Беларусі знаходзілася пад часовым кіраваннем ваеннай адміністрацыі; 2) з 1 верасня 1941 г. пачалася другая фаза акупацыі, звязаная з дзейнасцю цывільнай адміністрацыі на чале з генеральным камісарам В.Кубэ; 3) з 22 верасня 1943 г. пасля забойства В.Кубэ кіраўніцтва перайшло да начальніка СС і паліцыі ў Беларусі К. фон Готберга; 4) з 1 красавіка 1944 г., моманту выключэння Генеральнай акругі Беларусь са складу Рэйхскамісарыята Остланд, пачалася заключная фаза нямецкай акупацыі (с. 190).

А.Анціпава прыйшла да высновы, што галоўнай прыкметай нацысцкай моўнай палітыкі на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь з'яўлялася супярэчлівасць. Акупанты настойвалі на нацыянальным самавызначэнні беларусаў, і гэта паглыбляла ўнутраны раскол сярод мясцовага насельніцтва. Адміністрацыйны падзел тэрыторыі Беларусі на 5 розных частак таксама разглядаўся як умова для расколу краіны. Раёны Брэста, Кобрына, Пінска і Мазыра спачатку знаходзіліся ў часовым падпарадкаванні ваеннай адміністрацыі групы армій "Поўдзень", а ў далейшым увайшлі ў склад Рэйхскамісарыята Украіна. Беласток, які пасля 1939 г. быў у складзе БССР, разам з Гродна і Ваўкавыскам увайшоў у склад Усходняй Прусіі. Тэрыторыя вакол Ашмян была ўключана ў склад Генеральнай акругі Літва. Тэрыторыя, на якой пражывала чвэрць насельніцтва краіны, увайшла ў склад Генеральнай акругі Беларусь з цэнтрам у Мінску. Усходняя частка знаходзілася ў зоне тылу групы армій "Цэнтр".

Як адзначае даследчыца, пачынаючы з восені 1941 г. на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь акупанты праяўлялі пэўны клопат аб беларускай культуры, традыцыях і адукацыі. На тэрыторыі паўднёвай часткі Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Рэйхскамісарыята Украіна, са студзеня 1942 г. пачалося правядзенне палітыкі ўкраінізацыі. На тэрыторыі акругі

* Каваленя А.А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі. 1941—1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць. Мн., 1999; Літвін А.М. Акупацыя Беларусі (1941—1944): пытанні супраціву і калабарацыі. Мн., 2000.

Беласток і Генеральнай акругі Літва апрача афіцыйнай нямецкай мовы перавага надавалася польскай і літоўскай мовам. На той тэрыторыі Беларусі, што знаходзілася ў зоне тылу групы армій "Цэнтр", перавага надавалася рускай мове. Між тым, адзначаючы падыходы нямецкай акупацыйнай улады да моўнай палітыкі з улікам адміністрацыйнай прыналежнасці тэрыторыі Беларусі, даследчыца не паказвае спецыфіку практычнага выкарыстання беларускай мовы на прыкладзе яе ўжывання ў розных сферах паўсядзённага жыцця акупаванай Беларусі.

Даследчыца адзначае, што стаўленне да мовы стала адной з вызначальных прыкмет акупацыйнай улады на тэрыторыі Беларусі. Аднак на справе для акупантаў гэтае пытанне з'яўлялася другарадным на фоне тых задач, якія яны вырашалі на захопленай тэрыторыі. Даследчыца адзначае, што адначасова існавалі тры розныя падыходы да выкарыстання мовы ў афіцыйным справаводстве, выданні ўказаў і распараджэнняў акупацыйных органаў улады, навучання ў школах. Адметнасці моўнай палітыкі на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь зведзены аўтарам у схемы (с. 195), што ўяўляюць значную цікавасць для беларускіх чытачоў. Аснову першага падыходу склалі дырэктывы адносна моўнай палітыкі Імперскага міністэрства па справах акупаваных усходніх тэрыторый на чале з А.Розенбергам. Згодна з імі, дамінуючую ролю павінна была адыгрываць нямецкая мова, тады як беларуская, польская і руская мовы з'яўляліся другаснымі. Між тым А.Розенберг вылучаў беларускую мову і падкрэсліваў яе статус як адзінай мясцовай мовы, якой ён надаваў больш важную ролю ў параўнанні з рускай і польскай мовамі (с. 195). Паводле загаду А.Розенберга аб моўнай палітыцы ад 25 ліпеня 1942 г., у школах Генеральнай акругі Беларусь з 1 верасня 1942 г. у першым класе ўводзіўся ў якасці абавязковага лацінскі шрыфт, каб яшчэ больш аддаліць людзей ад рускамоўнай прасторы.

Моўную палітыку на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь А.Анціпава разглядае ў кантэксце палітыкі "нацысцкай беларусізацыі" В.Кубэ. Яе аснову склала ідэя па пераўтварэнні акругі ў жыццёвую прастору ў першую чаргу для беларусаў. Прадстаўнікі іншых народаў, якія жылі на гэтай прасторы, павінны былі арыентавацца на беларускую культуру. Мовай навучання ў школах павінна была быць выключна беларуская. На думку аўтара, такі падыход раскалоў насельніцтва акругі яшчэ больш. На тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь В.Кубэ не падтрымліваў ні польскую, ні рускую мовы, хоць і не забараняў іх. Паводле яго падыходу, беларуская мова павінна была займаць перадавую пазіцыю ў параўнанні з польскай і рускай мовамі. На практыцы пачынаючы з 1942 г. на тэрыторыі Генеральнай акругі, асабліва заходніх яе частак, адбывалася выцясненне палякаў беларусамі на ўзроўні мясцовых органаў кіравання. Асаблівую перавагу беларусы мелі пры працаўладкаванні ў школы, тады як настаўнікі іншых нацыянальнасцей павінны былі пераконваць акупацыйнае начальства ў лаяльнасці да беларускай культуры. У выніку ў 1941/1942 навучальным годзе ў 3050 школах акругі ў якасці настаўнікаў былі занятыя 8695 беларусаў, 1366 палякаў, 189 рускіх і 176 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей (с. 200). У гэтай сувязі беларускаму чытачу было б цікава даведацца, у якой ступені вынікі нямецкай моўнай палітыкі, адлюстраванай у матэрыяле нямецкага аўтара, падобныя ці розняцца з высновамі, да якіх прыйшлі беларускія даследчыкі ў ходзе правядзення навуковых даследаванняў. Так, напрыклад, паводле справаздач акруговых інспектараў Генеральнай акругі Беларусь, колькасць школ, якія працавалі на тэрыторыі акругі ў 1941/1942 навучальным годзе, складала 2600*.




*Схематычныя варыянты нацысцкай моўнай палітыкі ў Генеральнай акрузе Беларусь.* Схема складзеная ў Цэнтры ваенна-гістарычных даследаванняў у г. Патсдам.

Аднак планы В.Кубэ па правядзенні моўнай палітыкі не ажыццявіліся цалкам, паколькі ў верасні 1943 г. ён быў забіты. К. фон Готберг, які заняў пасаду генеральнага камісара, меў іншыя погляды на сітуацыю. У канцы лістапада 1943 г. ён заявіў, што народ разумее толькі рускую мову і гэта неабходна ўлічваць акупацыйным органам улады пры правядзенні сваёй палітыкі. Як адзначае А.Анціпава, пасля ўступлення на пасаду Готберг распачаў прынцыповыя змены ў структуры генеральнага камісарыята. У прыватнасці, ён імкнуўся да спалучэння кіраўніцтва камісарыята з сіламі СС і паліцыі тылавой зоны групы армій "Цэнтр". Новае кіраўніцтва аддавала перавагу рускай мове, паколькі лічыла рускую культуру больш развітай, чым беларуская. Да таго ж акцыі па замірэнню насельніцтва праводзіліся не толькі на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь, але на тых тэрыторы-

* Жылінскі М.Г. Адукацыя на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941—ліпень 1944 гг.). Мн., 2006. С. 165.

ях, якія знаходзіліся ў зоне тылу групы армій "Цэнтр", дзе перавага аддавалася рускай мове (с. 204—205). Узмацненне пазіцый кіраўніцтва СС азначала змяншэнне ролі цывільнай адміністрацыі, у тым ліку ўплыву А.Розенберга і яго надзейнага паплечніка В.Кубэ. У новых абставінах роля Готберга пачала ўзрастаць таксама і ў выніку таго, што ён прапанаваў выкарыстоўваць у школах кірылічны шрыфт, тады як лацінскі шрыфт, прыхільнікамі якога выступалі А.Розенберг і В.Кубэ, разглядаўся асновай узмацнення польскага нацыяналізму (с. 207). Такім чынам, дэклараванае акупацыйнай уладай станоўчае стаўленне да беларускай мовы не было на справе рэалізавана.

У наступным артыкуле *"Аплявуха генералу. Аб ролі канфліктаў сярод нямецкага акупацыйнага кіраўніцтва ў Рэйхскамісарыяце Остланд"* (с. 209—228) доктар навук з універсітэта ў Канстанцы (Германія) **С.Юнгеркес** даследуе ўнутраныя канфлікты сярод служачых акупацыйнай адміністрацыі Рэйхскамісарыята Остланд. Ён аналізуе ўзаемаадносіны некаторых кіруючых асоб, а таксама апісвае асобныя канфліктныя сітуацыі. Пры гэтым адзначаецца, што асабліва "жаркім" месцам з'яўлялася Рыга, дзе была сканцэнтравана вялікая колькасць прадстаўнікоў акупацыйнай адміністрацыі (с. 227).

Прафесар Фленсбургскага ўніверсітэта **У.Данкер** у матэрыяле *"Гісторыі і рэканструкцыя гісторыі для судоў і грамадскасці: наратыў злачынстваў на прыкладзе Хінрыка Лозэ"* (с. 229—250) апісвае жыццёвы шлях рэйхскамісара Остланда Х.Лозэ — чалавека, які быў адказны за правядзенне палітыкі генацыду, аднак пазбегнуў абвінавачванняў. Пасля вайны ён удзельнічаў у якасці сведкі ў Нюрнбергскім судовым працэсе над галоўнымі нацысцкімі злачынцамі, хаваючы рэальныя факты сваёй біяграфіі не толькі ад пракурорскіх работнікаў і грамадскасці, але нават ад сваёй сям'і і сяброў. Даследчык перакананы, што вывучэнне жыццёвага шляху на аснове не столькі біяграфічных, колькі дакументальных крыніц дазваляе паглядзець на людзей-злачынцаў з іншага боку, зразумець матывы іх дзеянняў. Такое даследаванне не павінна шкодзіць справе гістарычнага пазнання, наадварот, можа садзейнічаць стварэнню інтэграванага наратыву для вывучэння лёсу злачынцаў і высвятлення ступені іх удзелу ў злачынствах нацысцкага рэжыму на акупаванай усходняй тэрыторыі (с. 250).

У канцы вайны вялікая колькасць бежанцаў з тэрыторыі Прыбалтыкі апынулася ў Швецыі. З артыкула супрацоўніка ўніверсітэта ў г. Упсала **М.Дэланда** *"Адсутнасць пакаранняў: бяздзейнасць Швецыі ў дачыненні да злачынстваў у Прыбалтыцы"* (с. 251—268) вынікае, што многія памагатыя нямецкіх акупантаў, якія збеглі ў Швецыю, так і не прадсталі перад судом, хоць шведскія службы бяспекі яшчэ напрыканцы вайны пачалі збор даных аб іх шляхам апытання бежанцаў з тэрыторыі Прыбалтыкі. З-за бяздзейнасці шведскіх судовых органаў многія злачынцы засталіся без пакарання (с. 268).

На прыкладзе судовага працэсу над адным з забойцаў латышскіх яўрэяў В.Арайсам прафесар Фленсбургскага ўніверсітэта **Р.Бон** характарызуе гісторыю прававога пераследу ў ФРГ былых калабарантаў як удзельнікаў генацыду на акупаванай усходняй тэрыторыі. З матэрыялу *"Калабарацыя і генацыд у Рэйхскамісарыяце Остланд. Крымінальна-прававыя даследаванні ў ФРГ на прыкладзе працэсу над Арайсам"* (с. 269—285) вынікае, што былы начальнік дапаможнай паліцыі, сфарміраванай з латышоў (якія ў другой палове 1941 г. удзельнічалі ў забойствах больш за 13 тыс. яўрэяў у Рызе і яе ваколіцах), быў асуджаны гамбургскім зямельным судом на працяглы тэрмін турэмнага зняволення толькі ў снежні 1979 г. Да гэтага часу злачынец амаль 30 гадоў пражываў на тэрыторыі Германіі.

Прафесар **Ё.Гакман** з Інстытута гісторыі і міжнародных адносін у Шчэціне ў артыкуле *"Рэйхскамісарыят Остланд у святле германскай гістарыяграфіі"* (с. 285—302) прапануе даследаванне германскага навуковага наратыву і паказвае галоўныя напрамкі вывучэння нямецкімі даследчыкамі гісторыі Рэйхскамісарыята Остланд. Ён заўважае, што пасля выхаду прац прадстаўнікоў былой акупацыйнай адміністрацыі ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі дамінавалі не зусім навуковыя падыходы да тагачасных падзей. Гэтыя работы ўспрымаліся навукоўцамі некрытычна, выкладзеныя ў іх факты не аспрэчваліся. У работах давалася падрабязнае апісанне дзейнасці германскай акупацыйнай улады, але пры гэтым не паказваліся масавыя злачынствы ў дачыненні да савецкіх ваеннапалонных і мірных жыхароў, у тым ліку яўрэяў. Фактычным пачаткам навуковага даследавання гісторыі германскай акупацыі, калабарацыі і Халакосту аўтар лічыць пачатак 1990-х гг.

Агляд гістарыяграфіі па тэме германскай акупацыі на тэрыторыі, уключанай у Рэйхскамісарыят Остланд, дазволіў аўтару зрабіць шэраг высноў. Перш за ўсё даследаванне гэтай тэмы на рэгіянальным узроўні доўгі час не знаходзіла належнай увагі. Наступным крокам стала вывучэнне гісторыі цывільнай адміністрацыі і яе палітыкі на тэрыторыі Рэйхскамісарыята Остланд. Толькі з моманту з'яўлення ў сярэдзіне 1980-х гг. прац нямецкіх даследчыкаў Г.Краўсніка і Г.-Г.Вільхельма ў нямецкамоўным дыскурсе замацоўваецца іншы погляд на падзеі. Аснову яго складала даследаванне злачынстваў акупантаў у дачыненні да мірнага насельніцтва Рэйхскамісарыята Остланд, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі, Літвы, Латвіі і Эстоніі. Пасля гэтага ў фокус навуковага пошуку трапляюць пытанні калабарацыі і Халакосту і інш. Аднак сістэматызаванага даследавання па гісторыі Рэйхскамісарыята Остланд у нямецкай гістарыяграфіі да апошняга часу праведзена не было. Таму на парадку дня перад гісторыкамі стаіць задача напісання цэласнай карціны і стварэння комплекснага даследавання па гісторыі Рэйхскамісарыята Остланд (с. 301).

Доктар навук **К.Бэстляйн**, супрацоўнік Берлінскай зямельнай адміністрацыі, у матэрыяле на тэму *"Гістарыяграфія генацыду еўрапейскіх яўрэяў на прыкладзе Рэйхскамісарыята Остланд"* (с. 303—

329) адзначае, што па гэтым пытанні нямецкая гістарыяграфія мае некаторыя памылкі і асобныя хібы (с. 303). Даследаванне гэтай тэмы прайшло ў нямецкай гістарыяграфіі тры фазы. Першая ахоплівала час з 1945 па 1960 гг., калі панаваў спрошчаны погляд на германскую захопніцкую палітыку на тэрыторыі Рэйхскамісарыята Остланд. Гісторыя злачынстваў, якія мелі месца на ўсходзе, на той час не вывучалася, хоць асобныя звесткі пра гэтыя падзеі траплялі ў нямецкія навуковыя працы з англамоўнай літаратуры. Адметным фактам аўтар лічыць выхад у 1961 г. невялікай брашуры, аўтарам якой быў былы вязень мінскага гета берлінскі яўрэй Карл Лёвенштайн. У ёй упершыню была апісана трагедыя дэпартаваных у Мінск нямецкіх яўрэяў. Аднак заходнегерманскія гісторыкі праігнаравалі звесткі з гэтай работы, першае выданне якой выйшла ў сярэдзіне 1950-х гг. у якасці дадатку да штотыднёвага бюлетэня "Парламент" (с. 306). Не выканаў да канца сваіх пошукавых задач і Інстытут сучаснай гісторыі, створаны ў Мюнхене ў пачатку 1950-х гг., хоць сярод галоўных задач гэтай установы значылася "даследаванне нацыянал-сацыялізму", у тым ліку гісторыі нацысцкіх злачынстваў на ўсходзе.

Другая фаза ахоплівае 1960—1980-я гг., калі даследаванні гісторыі злачынстваў на ўсходзе былі адсунуты на другі план выданнямі ўспамінаў ахвяр генацыду. У той час у ФРГ выйшлі грунтоўныя працы Р.Хільберга "Знішчэнне еўрапейскіх яўрэяў" (1961, 1982), Г. фон Рауха "Гісторыя балтыйскіх дзяржаў" (1970), Г.Шнайдэр "Рыжскае гета" (1973), М.Мацісана "Успаміны аб першай палове XX ст." (1980) і інш. Аднак сістэматычнае даследаванне злачынстваў адбывалася ў асноўным у сувязі з судовымі працэсамі над нацысцкімі злачынцамі, асабліва на аснове дакументаў і новых крыніц.

Трэцяя фаза пачалася з 1990-х гг., калі назіралася асабліва імклівае развіццё даследаванняў Халакосту. Сярод прычын такога ўздыму аўтар называе адкрыццё архіваў у краінах Усходняй Еўропы. Былі апублікаваны шматлікія ўспаміны, грамадскасць пачала станоўча ўспрымаць акадэмічныя даследаванні па гісторыі Халакосту. У пераліку выданняў, датычных Беларусі, аўтар называе працы В.Бенца, Б.К'яры, К.Герлаха, В.Курылы і інш. Асаблівы ўклад у справу вывучэння генацыду яўрэяў унёс Інстытут сацыяльных даследаванняў у Гамбургу. Сучасны стан у нямецкай гістарыяграфіі пераконвае ў тым, што грунтоўнае вывучэнне праблематыкі Халакосту ў Беларусі толькі пачынаецца (с. 328), паколькі адсутнічаюць спецыяльныя навуковыя працы аб дэпартацыі яўрэяў, гісторыі гета, лагераў і месцаў масавых забойстваў соцень, тысяч і дзясяткаў тысяч ахвяр на тэрыторыі Беларусі.

Даследчык гамбургскага Інстытута культуры і гісторыі ў Паўночнай Еўропе **Ё.Таўбэр** прадставіў матэрыял на тэму *"Пераадоленне мінулага ў Літве. Палітыка, грамадства і Халакост пасля 1945 г."* (с. 331—348). Ён бачыць у якасці актуальнай задачы паказ працэсу вынішчэння яўрэяў у Літве, да якога з самага пачатку акупацыі далучыліся мясцовыя памагатыя. У цэнтр дыскурсу пастаўленыя злачынствы, якія рабіліся ў дачыненні да яўрэйскага насельніцтва ў адпаведнасці з палітыка-ідэалагічнымі мэтамі вядзення нацыстамі расавай вайны на ўсходзе. Кажучы аб вывучэнні гэтай тэмы ў літоўскай гістарыяграфіі, аўтар адзначае, што з сярэдзіны 1990-х гг. гісторыкамі гэтай краіны зроблены даволі важны крок на гэтым шляху, але асобныя пытанні па даследаванні гісторыі Халакосту пакуль застаюцца адкрытымі, у тым ліку пытанне аб важнасці навуковага вывучэння гэтай трагедыі ў "кантэксце перспектыўных задач захавання калектыўнай памяці ў літоўскім грамадстве".

Заключны матэрыял *"Малое зло. Генеральны камісарыят Эстонія ў эстонскім гістарычным дыскурсе"* (с. 349—366) аб падзеях на тэрыторыі Генеральнай акругі Эстонія прадстаўлены прафесарам універсітэта ў Тарту **О.Мартэльсманам**. Аўтар аналізуе характар навуковага дыскурсу ў эстонскім грамадстве аб чатырохгадовым перыядзе германскай акупацыі і паводзінах эстонцаў у той час. Як адзначае даследчык, гістарычная навука Эстоніі ў савецкі час з'ўлялася часткай агульнасавецкай гісторыі, таму асобныя тэмы ў ёй заставаліся без увагі. У апошні час дыскурс аб нацыянальнай гісторыі ў краіне ідзе даволі няпроста (с. 366), асабліва з улікам новых тэндэнцый па вывучэнні гісторыі Другой сусветнай вайны ў кантэксце агульнаеўрапейскіх навуковых падыходаў.

Адзначаючы высокую актуальнасць заяўленай праблематыкі, неабходна заўважыць, што ў сучаснай замежнай гістарыяграфіі акрэсленая тэматыка распрацавана даволі слаба, хоць нямецкімі даследчыкамі і створаны асобныя грунтоўныя працы па некаторых аспектах гісторыі Рэйхскамісарыята Остланд у 1941—1944 гг. Міжнародны калектыў аўтараў заявіў, што з выданнем гэтай агульнай працы могуць быць створаны новыя напрамкі даследаванняў. Атрыманыя вынікі значна пашыраюць веды аб розных падзеях паўсядзённай гісторыі, дапаўняюць агульнавядомыя тэарэтычныя і практычныя палажэнні. Разам з тым зазначым, што ў цэлым матэрыялы зборніка прынцыпова не змянілі ўжо існуючую карціну гісторыі германскай акупацыі так званых усходніх тэрыторый, у тым ліку Беларусі. Многія, аднак не ўсе, важныя сюжэты гэтай карціны набылі завершаны выгляд, былі дапоўнены і ўзбагачаны новымі ведамі.

У гэтым сэнсе кніга вызначаецца навізной і доказнасцю. Яе факталагічны і тэарэтычны змест мае высокую значнасць. Заслугоўвае падтрымкі і спроба аўтараў правесці навуковае вывучэнне рэгіянальнай гісторыі на аснове метаду гістарыяграфічнай і крыніцазнаўчай кампаратывістыкі. З арыентацыяй на згаданы вопыт беларускай і нямецкай гістарыяграфіі неабходна шырэй практыкаваць правядзенне даследаванняў на комплекснай аснове, прычым з удзелам навукоўцаў абедзвюх краін, якія смела звяртаюцца да малавядомых крыніц. Адсутнасць жа міжнароднага кантэксту гістарычных пошукаў істотна абмяжоўвае перспектывы далейшага вывучэння ваеннай гісторыі ўвогуле і гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў прыватнасці.